# АВАЛОДАННЕ ВЫМАЎЛЕННЕМ ГУКАЎ, СЛОЎ

Н.С.Старжинская, Д.Н.Дубинина

У дамаўленчы перыяд у лепятанні дзіцяці рэгіструецца вялікая колькасць разнастайных гукаў, у тым ліку і тых, што не ўласцівы роднай мове. Лепетныя гукі неадвольныя, яны ніяк не кантралююцца свядомасцю. Гэтыя гукі, паводле трапнай заўвазе М.Х. Швачкіна, “вымаўляюцца самі”.

◄ *Ці функцыянуюць у далейшым“лепетныя” гукі ў якасці фанем?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як сцвярджаюць даследчыкі, лепет і маўленне – два зусім розныя цыклы артыкуляцыйнай маторыкі. Пераходзячы да славеснага маўлення, дзіця пачынае як бы з нуля – з надзвычай абмежаванага набора гукаў. Калі гукі становяцца матэрыялам першых засвоеных слоў, яны набываюць перцэптыўную і сігніфікатыўную функцыі – становяцца фанемамі, чаго нельга сказаць аб гуках лепятання. Цяпер дзіця павінна гаварыць так, як гавораць акружаючыя дарослыя, г.зн. звяраць з дапамогай фанематычнага слыху атрыманы вынік з узорам. Таму нават тыя гукі, якія дзіця з лёгкасцю вымаўляла падчас лепятання, яно цяпер засвойвае доўга і з цяжкасцямі. Глыбінным механізмам пераходу ад лепятання да мовы выступае авалоданне сістемай фаналагічных проціпастаўленняў, характэрных для данай мовы.

◄ *Як адбываецца засваенне фанемнай сістэмы мовы?*

Авалоданне фанетычным складам маўлення пачынаецца ў канцы першага года жыцця дзіцяці. Спецыялісты па дзіцячай фанетыцы прапанавалі лічыць перыядам засваення гукавой асновы маўлення тэрмін ад вымаўлення першага слова да апошняга засвоенага гука (В.І. Бельцюкоў, А.Д. Салахава). Гэты перыяд індывідуальны для кожнага дзіцяці і можа вагацца ад 1года 5-6 месяцаў да 4 з паловай гадоў.

Вымаўленне галосных даецца дзецям лягчэй, чым зычных. Першым у працэсе антагенетычнага развіцця фарміруецца праціпастаўленне максімальна адкрытага, шырокага галоснага гука [а] астатнім галосным. Затым засвойваюцца галосныя [і], [у], пасля гэтага - [о], [э]. Гук [ы] звычайна замяняецца гукам [і], вымаўленне яго засвойваецца пазней.

Паслядоўнасць засваення зычных гукаў у большасці дзяцей свету аднолькавая. Гукі ў складзе першых слоў з'яўляюцца групамі па меры азваення пэўных артыкутарных пазіцый. Губныя зычныя ([м], [б], [п]) з'яляюцца раней за язычныя ([д], [т] [г] [к]); мяккія язычныя раней за цвёрдыя, а глухія раней за звонція. Пазней за ўсё дзеці засвойваюць вымаўленне свісцячых ([с], [с'], [з], [з'], [ц]) шыпячых ([ш], [ж], [ч]), санорных [р] (у рускай мове і [р']) зычных гукаў. Пры гэтым дакладнасць артыкуляцыі гука залежыць ад яго пазіцыі ў складзе і ў слове.

Усё гэта гаворыць пра тое, што дзіця засвойвае не ўласна гукі, а больш складаныя артыкуляцыйныя комплексы.

*У раннім і малодшым дашкольным узросце* многія гукі дзеці не вымаўляюць зусім або вымаўляюць няправільна, ці замяняюць іх іншымі гукамі (*ак* замест *рак, зюк* замест *жук, сапка* замест *шапка*). З'ява замены аднаго гука іншым называецца ***субстытуцыяй***. Без субстытуцыі немагчыма авалодаць гукавой сістэмай роднай мовы. Часцей за ўсё на месцы гука, які дзіця яшчэ не вымаўляе, з'яўляецца гук, найбольш падобны да яго па артыкуляцыйных характарыстыках (*доссік* замест *дождждык*, *Баля* замест *Валя*). Дзіця паступова пераходзіць ад аднаго субстытута да іншага, усё больш набліжаючыся за нарматыўнага вымаўлення. У цэлым маўленне характарызуецца агульнай змякчонасцю (*лізіцька* – лыжачка, *міська* – мышка).

◄ *Ці ёсць нейкія асаблівасці ў засваенні складовай будовы слоў?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Назіраюцца некаторыя асаблівасці ўзнаўлення малымі дзецьмі складовай структуры слова. Гэта, перш за ўсё, з’ва пад назвай ***складовая элізія*** – скарачэнне слоў. Паколькі першыя словы дзіцяці ўключаюць адзін, максімум два склады, “доўгія” словы (трох- чатырохскладовыя) малы спачатку імкнецца скараціць да звыклых яму адно- двухскладовых. Складовая элізія залежыць ад размяшчэння складоў у адносінах да націскнога склада. Спачатку дзіця здольнае ўзнавіць толькі націскны склад (*бан* замест “барабан”). Далей малы пачынае арыентавацца на першы склад, пераносячы на яго націск (*ба* замест “барабан”). Наступны крок – дзіця ўзнаўляе першы і націскны склад у сукупнасці (*бабан*). І, нарэшце, дзіця засвойвае рытмічную структуру слова поўнасцю.

Другой асаблівасцю ўзнаўлення складовай структуры слова з’яўляецца ***метатэзіс*** – перастаноўка гукаў або кладоў у слове. Дзеці часта называюць сабаку *басякай,* малаток  – *маталком,* чарвяка - *чаўраком*. Замест гольфы гавораць *гофлі*, замест клякса- *кляска*.

*Не ўсе дзеці аднолькава авалодваюць гукавой сістэмай маўлення*. Адны імкнуцца перш за ўсё ўзнавіць рытміка-меладычную структуру слова і не клапоцяцца аб якасці гукаў, што яго складаюць: *ціся* – кніжка, *цянянянь* - тэлефон. Гэта дзеці “складовага” тыпу. Другія дзеці – “гукавы” тып – імкнуцца дасягнуць дакладнасці артыкуляцыі гукаў, таму асвойваюць слова па частках на працягу некалькіх месяцаў: *па – папа – паця – папаця – папата – лапата*.

*На чацвёртым-пятым годзе жыцця* колькасць гукаў, якія вымаўляюцца няправільна, значна памяншаецца, знікае іх агульнае змякчэнне, больш рэдка сустракаюцца парушэнні ў складовай структуры слова. У дзяцей з’яўляецца правільнае (хаця і нястойкае) вымаўленне свісцячых, шыпячых гукаў і [р]: у адным гукаспалучэнні дзіця правільна вымаўляе гэтыя гукі, у другім – няправільна. Тыповай з’яўляецца “адваротная замена” гукаў, калі замест старога субсцітута ставіцца толькі што засвоены гук (*Рарыса* замест Ларыса*, жамок* –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

замок, *шлон* – слон). Не заўсёды дзеці дыферэнцыруюць гукі, блізкія ў акустычных або артыкуляцыйных адносінах: *ж – з, ш – с* і г.д.

У развіцці гукавога ладу маўлення *ў дзяцей на пятым годзе жыцця* назіраецца свайго роду супярэчлівасць. З аднаго боку – асаблівая адчувальнасць да гукаў маўлення, у дастатковай ступені развіты фанематычны слых; з другога боку – недастатковае развіццё артыкуляцыйнага апарата і поўная абыякавасць да артыкуляцыі.

Традыцыйна лічылася, што большасць дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту правільна вымаўляе ўсе гукі роднай мовы і толькі ў асобных дзяцей ёсць недахопы вымаўлення шыпячых, санорных або часам свісцячых гукаў. Аднак за апошнія гады ўзровень гукавымаўлення старэйшых дашкольнікаў значна знізіўся. Паводле даных А.Г.Арушанавай, каля 40% шасцігадовых дзяцей паступаюць у школу з недахопамі вымаўлення. Гэта звязана з узросшымі нярвовай напружанасцю дзяцей, эмацыянальным дыскамфортам, дэфіцытам асобасных змястоўных зносін. Гэтыя фактары аказваюць прыгнятальны ўплыў на маўленчы слых, маўленчую ўвагу, развіццё артыкуляцыйнага апарату, а таксама па партнёрскія адносіны дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У дашкольны перыяд дзеці пачынаюць асэнсоўваць нормы вымаўлення, клапаціцца аб яго правільнасці. Аднак яны не могуць вылучыць і назваць гук, які трэба выправіль, а выпраўляюць усё слова цалкам: “Не скола, а школа”.

◄ *Як авалодваюць дзеці надлінейнымі гукавымі сродкамі?*

У першую чаргу дзіця пачынае ўспрымаць і ўзнаўляць такія надлінейныя характарыстыкі маўлення, як гучнасць і вышыня голасу. Гэта тлумачыцца тым, што малы імкнецца, перш за ўсё, выразіць свае эмацыянальнае стаўленне да таго, што адбываецца з ім і вакол яго.

Затым дзіця авалодвае рытмічнай структурай слоў, якая вызначаецца для яго колькасцю складоў і месцам націскнога складу. Гэты працэс разгледжаны вышэй.

Што датычыцца засваення інтанацыйнай выразнасці маўлення, тот тут існуюць пэўныя асаблівасці. Дзеці ранняга і малодшага дашкольнага ўзросту выкарыстоўваюць інтанацыйныя характарыстыкі для перадачы сваіх камунікатыўных намераў, але яны карыстаюцца інтанацыйнымі сродкамі неасэнсавана. Яны толькі выражаюць свае стаўленне да рэчаіснасці або да таго, што ім паведамляецца. З цягам часу ўзровень інтанацыйнай выразнасці маўлення дзяцей зніжаецца. У выніку выказванні дзяцей пяці-шасці гадоў характарызуюцца манатоннасцю, адсутнасцю інтанацыйнай афармленасці. Гэта тлумачыцца тым, што яны ўжо валодаюць іншымі разнастайнымі моўнымі сродкамі для выражэння свайго стаўлення да таго, што выказваецца: лексічнымі (сінонімамі, антонімамі і інш.) марфалагічнымі (суфіксамі ацэнкі: таўставаты, сланішка), сінтаксічнымі (парадак слоў). Таму выкарыстанне інтанацыі адыходзіць на другі план. З гэтай прычыны выхаванне асэнсаванай гукавой выразнасці маўлення з’яўляецца адной з прыярытэтных задач фарміравання гукавой культуры маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ